**Харытончык Г.А.**,*ст.выкладчык*

# АСАБЛІВАСЦІ СУЧАСНАГА ПАДЫХОДУ ДА ХАТНЯГА ЧЫТАННЯ СТУДЭНТАЎ

Асноўнымі мэтамі вывучэння замежных моў на першых курсах вышэйшых навучальных устаноў з'яўляюцца фарміраванне ўменняў і навыкаў чытання і перакладу літаратуры сярэдняй цяжкасці па спецыяльнасці, чытання і перакладу грамадска-палітычных тэкстаў пры дапамозе слоўніка, а таксама разуменне нескладанага мастацкага тэксту без слоўніка. У вырашэнні іх вялікую ролю адыгрывае хатняе, альбо пазаўдыторнае, чытанне.

Асаблівасцю сучаснага падыходу да чытання з'яўляецца тое, што яно разглядаецца як крыніца інфармацыі, а не толькі як прыём навучання, які забяспечвае засваенне моўнага матэрыялу. Яно трэніруе навыкі і ўменні студэнтаў і рыхтуе іх да больш складанага і дасканалага чытання - чытання і разумення літаратуры па спецыяльнасці.

Мэта выкладчыка ў тым, каб вызваліць чытанне ад пераважна вучэбных задач і надаць яму характар чытання з ахопам зместу, з вылучэннем карыснай інфармацыі з тэксту.

Неабходна навучыць студэнтаў пераадольваць такія цяжкасці, як незнаёмыя словы (спалучэнні слоў), граматычныя формы і г. д. Такое чытанне грунтуецца на ўменні навучэнцаў бачыць, знаходзіць і правільна выкарыстоўваць лінгвістычныя і экстралінгвістычныя апоры.

Да лінгвістычных апор адносяцца лексіка-граматычныя канструкцыі, якімі студэнты актыўна валодаюць і якія могуць падказаць ім пэўныя арыенціры (напрыклад, інтэрнацыяналізмы, словаўтваральныя прыметы, граматычныя формы дзеясловаў і інш.).

Экстралінгвістычныя апоры - з'явы ў тэксце, якія дапамагаюць навучэнцам выкарыстоўваць сэнсавую здагадку. Гэта могуць быць прозвішчы пісьменнікаў, кампазітараў, дзеячаў культуры і мастацтва, геаграфічныя назвы, інакш кажучы, нейкія азначэнні, добра вядомыя ў роднай мове.

Тэксты для хатняга чытання павінны быць адаптаванымі і адпавядаць ведам студэнтаў. Яны могуць быць узяты з мастацкай, грамадска-палітычнай, навукова-папулярнай літаратуры і змяшчаць цікавы для студэнтаў матэрыял.

Для хатняга чытання прапануюцца два яго віды: чытанне з агульным ахопам зместу і чытанне з элементамі аналізу.

Пазаўдыторнае чытанне можа быць карысным толькі тады, калі яно праводзіцца сістэматычна. Мэтанакіраванасць і дакладнасць у заданнях з'яўляюцца гарантам іх паспяховага выканання.

У цяперашні час існуюць два напрамкі, якія вызначаюць мэты пазаўдыторнага чытання:

1) чытанне, каб зразумець тэкст, г. зн. уласна чытанне;

2) чытанне як падрыхтоўка да размовы па прачытанаму.

У выніку пазаўдыторнае чытанне садзейнічае развіццю ўменняў чытаць, асабліва чытаць сам сабе. Яно пашырае кругагляд студэнтаў і прымушае іх вучыцца самастойна, удумліва працаваць над тэкстам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ